Раства чароўныя імгненні…

Галоўнае зімовае свята - Раство Хрыстова. На працягу многіх стагоддзяў Каляды дораць людзям святло веры і надзеі, напаўняюць сэрца дабрынёй і любоўю.

27 снежня 2021 года для выхаванцаў аддзялення дзённага знаходжання інвалідаў ДУ «ТЦСАН Ашмянскага раёна» і іх бацькоў сястра Рыта прыхода храма Святога Міхаіла Арханёла з валанцёрамі-школьнікамі падрыхтавалі Калядны лялечны спектакль. Сустрэча яшчэ раз нагадала ўсім прысутным пра падзею, якая адбылася больш 2000 гадоў таму і падарыла шмат станоўчых эмоцый. Пасля прадстаўлення было бліц-пытанне, «артысты» лялечнага спектакля правялі флэшмоб, а цацкі-сюрпрызы і, вядома, салодкія падарункі, дапамаглі яшчэ раз акунуцца ў свет дабрыні і чараўніцтва.











